стварыў Царства Польскае і прадаставіў яму аўтаномію і канстытуцыю. У паланізаванай шляхты Літвы і Беларусі з'явіліся надзеі на далучэнне да яго беларуска-літоўскіх зямель. Сярод апалячанай шляхты і інтэлігенцыі выспявала ідэя адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Яна стала вызначальнай у грамадскім жыцці Беларусі на бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

1. Як змянілася геапалітычнае становішча беларускіх зямель у канцы XVIII ст.? Якія змены адбыліся ў кіраванні беларускімі землямі?
2. Чым была абумоўлена спроба расійскага ўрада вырашыць пытанне аб адраджэнні ВКЛ у складзе Расійскай імперыі? У чым заключаўся «план Агінскага»?
3. Чаму і з якой мэтай Напалеон I стварыў Часовы ўрад Вялікага Княства Літоўскага?
4. Якім было стаўленне розных слаёў насельніцтва Беларусі да вайны? Чым, на ваш погляд, яно было абумоўлена?
5. Ацаніце наступствы вайны 1812 г. для беларускіх зямель. Што азначаў маніфест Аляксандра I аб «забыцці мінулага, усеагульным дараванні»? Як вы думаеце, чым тлумачылася такая пазіцыя расійскага ўрада?

## § 14. Беларусь ва ўмовах Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў

§ 14-1

§ 14-2

Якімі былі прычыны і характар Першай сусветнай вайны?

**Становішча беларускіх губерняў у час Першай сусветнай вайны.** 1 жніўня 1914 г. Расійская імперыя ўступіла ў Першую сусветную вайну, у якую былі ўцягнуты 38 краін з насельніцтвам 1,5 млрд чалавек. У першыя дні вайны ў Беларусі было аб'яўлена ваеннае становішча. Забараняліся забастоўкі, вулічныя шэсці, маніфестацыі. Уводзіліся жорсткі паліцэйскі рэжым і цэнзура. Царскі ўрад, праваслаўнае духавенства, ліберальныя і манархічныя партыі разгарнулі масавую ідэалагічную кампанію ў абарону Айчыны. У Мінску, Магілёве, Віцебску, Вільні, Гродне і іншых буйны́х цэнтрах прайшлі дэманстрацыі ў падтрымку вайны.

У палітычную кампанію «абароны Айчыны» ўключыліся і левыя палітычныя партыі — эсэры, меншавікі, Бунд. Буржуазія і памешчыкі, частка інтэлігенцыі Беларусі выразілі самую рашучую падтрымку палітыцы царызму. З усіх партый толькі бальшавікі адмовіліся падтрымаць расійскі ўрад у вайне. Яны назвалі вайну


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

злачыннай і заклікалі да пераўтварэння «вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую за сацыялізм».

*Абмяркуйце, што абазначаў лозунг партыі бальшавікоў.*

Антываенную пазіцыю заняла газета «Наша Ніва», якая з 1906 г. была ідэйным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Газета паказвала, што «вайна пачалася і вядзецца не ў інтарэсах народа, нясе мільёнам працоўных не свабоду, згоду і шчасце, а пагрозу гібелі і незлічоных ахвяр».




Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні ў 1915–1916 гг.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Аказанне дапамогі пацярпеламу ад газу. Віленская губерня. 1915–1917 гг.

Насельніцтва Беларусі паставілася да вайны як да страшнага бедства. У Беларусі масавая мабілізацыя мужчын у войска была сустрэта сялянскімі хваляваннямі і рабочымі забастоўкамі.

У першыя месяцы вайны расійская армія вяла даволі паспяховыя дзеянні супраць германскіх войскаў. Але ў пачатку 1915 г. асноўныя ваенныя сілы Германіі былі кінуты супраць Расіі, і пачалося іх імклівае наступленне ў напрамку Коўна — Вільня — Мінск.

З лета 1915 г. тэрыторыя Беларусі стала арэнай жорсткіх і цяжкіх баёў. Патрыятычныя настроі змяніліся масавым расчараваннем. 31 жніўня германскія войскі захапілі Свянцяны і Вілейку, у верасні — Вільню, Гродна, Брэст, Ліду, Навагрудак, Баранавічы. 19 верасня была перарэзана чыгуначная лінія Мінск — Масква ў раёне Смалявічаў. У кастрычніку коштам вялікіх высілкаў рускім войскам удалося ліквідаваць прарыў і адкінуць ворага ў раён азёр Свір і Нарач. З восені 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск — Паставы — Смаргонь — Баранавічы — Пінск. Пад акупацыяй апынуліся тэрыторыі Гродзенскай і значная частка Віленскай і Мінскай губерняў з насельніцтвам да 2,6 млн чалавек.

У сувязі з наступленнем германскіх войскаў з тэрыторыі Польшчы, Літвы і заходніх раёнаў Беларусі на ўсход перамясцілася больш за 1,3 млн бежанцаў. Гэта прывяло да перанаселенасці гарадоў і мястэчак цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. Так, насельніцтва Мінска на працягу 1915 г. павялічылася са 100 тыс. да 200 тыс. чалавек. У сувязі з гэтым абвастрыліся праблемы жылля, харчавання, бытавога і медыцынскага абслугоўвання. Усё большае распаўсюджванне атрымлівала спекуляцыя. Кожны дзень падымаліся цэны, папяровыя грошы абясцэньваліся.

? *Выкарыстоўваючы картасхему на с. 109, складзіце тры тэзісы, якія характарызуюць геапалітычнае становішча беларускіх зямель восенню 1915 г.*

Вайна нанесла істотную шкоду эканоміцы Беларусі. Узровень вытворчасці прамысловай прадукцыі катастрафічна знізіўся. З акупіраванай тэрыторыі Беларусі перад адступленнем былі вывезены ў Расію сотні прамысловых прадпрыемстваў. Тыя, што засталіся, немцы вывозілі ў Германію. У вялікай колькасці аку-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

панты вывозілі сельскагаспадарчую прадукцыю, жывёлу, матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці. Многіх жыхароў Беларусі прымусова адпраўлялі на працу ў Германію.

У канцы 1915 г. на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі працавалі толькі 140 прамысловых прадпрыемстваў. Аб'ём прадукцыі, якую яны выпускалі, складаў усяго 30 % ад даваеннага ўзроўню. Аб'ём вытворчасці павялічылі толькі тыя прадпрыемствы, якія выраблялі прадукцыю для патрэб арміі. Не менш цяжкае становішча склалася і ў сельскай гаспадарцы. Мабілізацыя ў войска каля 50 % мужчынскага насельніцтва, рэквізіцыі жывёлы, фуражу прывялі да скарачэння плошчы апрацаванай зямлі на 40—45 %. Дарослае працаздольнае насельніцтва прыцягвалася да рамонту і будаўніцтва дарог, мастоў, абарончых збудаванняў і інш.

*Якая інфармацыя аб эканамічным становішчы Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны знайшла адлюстраванне на картасхеме на с. 109?*

Царскі ўрад для пакрыцця ваенных расходаў у першыя два гады вайны амаль у два разы павялічыў падаткі, што рэзка знізіла ўзровень жыцця насельніцтва.

У канцы 1916 г. узмацніліся антываенныя настроі ў гарадах, сельскай мясцовасці, у дзеючай арміі. Пачалі баставаць чыгуначнікі, рабочыя ваенных вытворчасцей Мінска, Магілёва, Віцебска, Гомеля, Барысава. Асноўным патрабаваннем бастуючых з'яўлялася павышэнне заработнай платы. Аднак забастоўкі былі разрозненымі. У іх удзельнічала толькі частка рабочых. Масавага рабочага руху не назіралася. Гэта было звязана з прыфрантавым і ваенным становішчам беларускіх зямель. Пачалося масавае дэзерцірства ў войску. Цэлыя часці і злучэнні адмаўляліся ісці ў наступленне. Узмацнілася антыўрадавая агітацыя сярод салдат. Спыніць працэс разлажэння арміі не ўдавалася, яна паступова губляла баяздольнасць.

Вайна зрабіла сур'ёзны ўплыў на беларускі нацыянальны рух. Усе даваенныя беларускія нацыянальна-культурныя арганізацыі і таварыствы распаліся, спынілася выданне газет і кніг.

Частка дзеячаў нацыянальнага руху была мабілізавана ў дзеючае войска, іншыя выехалі з Вільні ў розныя гарады Расіі, дзе прымалі ўдзел у арганізацыі бежанскіх камітэтаў. З дазволу расійскіх улад дзеячамі беларускага нацыянальнага руху было створана Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Яно імкнулася аб'яднаць пад сваім кіраўніцтвам разрозненыя беларускія арганізацыі. З гэтай мэтай з восені 1916 г. у Петраградзе сталі выходзіць беларускамоўныя штотыднёвыя газеты «Дзянніца» і «Светач», якія выдаваліся пад рэдакцыяй З. Жылуновіча (Ц. Гартны).

Частка лідараў беларускага нацыянальнага руху (А. і І. Луцкевічы, В. Ластоўскі, А. Пашкевіч і інш.) засталіся ў акупіраванай Вільні.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Заключэнне Брэсцкага мірнага дагавора. Брэст-Літоўск, 3 сакавіка 1918 г.

**Вынікі Брэсцкага міру для Беларусі.** 9 снежня 1917 г. у Брэст-Літоўску пачаліся мірныя перамовы паміж Савецкай Расіяй і Германіяй. Расійскі бок, разлічваючы на сацыялістычную рэвалюцыю ў Германіі, імкнуўся зацягнуць перамовы. У гэтых умовах 18 лютага 1918 г. германскія войскі аднавілі наступленне па ўсёй лініі фронту.

Не маючы моцы спыніць германскае наступленне, савецкае кіраўніцтва вымушана было 3 сакавіка 1918 г. заключыць у Брэст-Літоўску мірны дагавор на ўмовах Германіі. Паводле дагавора тэрыторыя Беларусі падзялялася на некалькі частак. Землі на захад ад лініі Дзвінск — Ліда — Пружаны — Брэст-Літоўск адыходзілі Германіі. Частка Беларусі на поўдзень ад Палескай чыгункі перадавалася Украінскай Народнай Рэспубліцы. Астатнія землі разглядаліся як тэрыторыя Савецкай Расіі. Беларусь не атрымала нічога на аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі, паколькі Расія і Германія ўзаемна адмовіліся кампенсаваць страты, нанесеныя вайной. Пры заключэнні міру інтарэсы Беларусі ні адным з удзельнікаў перамоў не ўлічваліся. Аднак трэба заўважыць, што бальшавікі разглядалі Брэсцкі мір як часовую, тактычную меру і таму пагадзіліся на нявыгадныя ўмовы. Такі падыход аказаўся правільным. Пасля паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне ў лістападзе 1918 г. і вывада германскіх войскаў з тэрыторыі Беларусі Брэсцкі мір быў ануляваны рашэннем УЦВК.

**Становішча ў час польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.** У лістападзе 1918 г. была адноўлена незалежнасць Польшчы. Яе ўрад на чале з Ю. Пілсудскім,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Вызначце прычыны савецка-польскай вайны і мэты яе ініцыятараў.*

абапіраючыся на фінансавую і ваенную падтрымку краін Антанты і ЗША, прыступіў да рэалізацыі плана адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Стварыўшы за кароткі тэрмін магутную армію, у лютым 1919 г. Польшча пачала наступленне на тэрыторыю беларускіх зямель. Беларусь у чарговы раз апынулася ў сферы саперніцтва геапалітычных інтарэсаў знешніх сіл, на гэты раз Савецкай Расіі і Польшчы.



Байцы палка, сфарміраванага камітэтамі беднаты, перад адпраўкай на Заходні фронт

Да сярэдзіны сакавіка 1919 г. польскія войскі захапілі Брэст, Слонім, Шчучын, Пінск, Баранавічы. У красавіку яны занялі Вільню. 8 жніўня быў захоплены Мінск, абарона якога працягвалася 39 дзён. У кастрычніку наступленне праціўніка было спынена па лініі Полацк — рака Бярэзіна — рака Дняпро.

На захопленай тэрыторыі быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым. Польскія ўлады ліквідавалі савецкія органы кіравання і адмянілі дэкрэты савецкай улады, вярнулі канфіскаваную бальшавікамі зямлю польскім памешчыкам, праводзілі рэквізіцыі. Многія дзеячы беларускага нацыянальнага руху апынуліся ў польскіх турмах.

Палітыка польскіх улад выклікала супраціўленне, якое ўзначалілі беларускія эсэры і бальшавікі. Пад іх кіраўніцтвам арганізоўваліся партызанскія атрады. У снежні 1919 г. паміж бальшавікамі і эсэрамі было заключана пагадненне аб стварэнні адзінага фронту барацьбы. Да гэтага пагаднення далучыліся і іншыя нацыянальна-дэмакратычныя партыі, у тым ліку Беларуская камуністычная арганізацыя (БКА) на чале з У. Ігнатоўскім. Стварэнне адзінага антыпольскага фронту барацьбы прывяло да станоўчых вынікаў.

Рада БНР, якая раней дзейнічала ва ўмовах нямецкай акупацыі, звярнулася да польскага ўрада з просьбай аб перадачы ёй улады на захопленых палякамі беларускіх землях. Аднак у планы Ю. Пілсудскага прызнанне незалежнасці БНР не ўваходзіла. Ён прапанаваў заключыць унію Польшчы і Беларусі. Гэта выклікала ідэйны раскол у кіраўніцтве Рады БНР на прыхільнікаў і праціўнікаў саюза з Польшчай.

14 мая 1920 г. Чырвоная армія пад камандаваннем М. Тухачэўскага пачала наступленне на Заходнім фронце. Аднак у выніку жорсткіх баёў была вымушана

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

адступіць за раку Бярэзіну. Нягледзячы на складанае становішча, у пачатку ліпеня 1920 г. войскі Заходняга фронту спынілі наступленне палякаў і самі перайшлі ў контрнаступленне.

Былі вызвалены Рэчыца, Мазыр, Бабруйск, 10 ліпеня — Мінск. Да канца ліпеня ад польскіх войскаў былі ачышчаны Гродна, Пінск, Баранавічы, 1 жніўня — Брэст. У другой палове ліпеня 1920 г. войскі Заходняга фронту ўступілі на тэрыторыю Польшчы.

У канцы жніўня 1920 г. наступленне Чырвонай арміі было спынена пад Варшавай, і польскія войскі перайшлі ў контрнаступленне. У канцы верасня 1920 г. палякі захапілі Ваўкавыск і Пінск. Да пачатку кастрычніка фронт стабілізаваўся па лініі возера Нарач — Койданава — Слуцк. Такім чынам, Заходняя Беларусь была акупіравана Польшчай.

12 кастрычніка 1920 г. было заключана часовае перамір'е паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Па ўмовах перамір'я ваенныя дзеянні на Заходнім фронце павінны былі спыніцца 18 кастрычніка. Польскія войскі, аднак, працягвалі наступленне і 15 кастрычніка захапілі Мінск. Але ўжо 17 кастрычніка палякі пакінулі горад. Згодна з умовамі перамір'я сталіца Беларусі заставалася за савецкім бокам.

**Рыжскі мірны дагавор і яго наступствы для Беларусі.** 18 сакавіка 1921 г. у Рызе без удзелу беларускай дэлегацыі быў падпісаны мірны дагавор. Ён усталяваў межы паміж РСФСР, УССР, БССР і Польшчай. Прызнанне Польшчай незалежнасці Беларусі азначала, што Польшча стала першай заходняй дзяржавай, якая юрыдычна прызнала ССРБ і пацвердзіла гатоўнасць наладзіць з ёю дыпламатычныя адносіны.

Беларусь была падзелена на тры часткі. Польшча акупіравала заходнюю частку тэрыторыі Беларусі агульнай плошчай больш за 110 тыс. км$^2$ з насельніцтвам звыш 4 млн чалавек. У склад ССРБ увайшлі шэсць паветаў Мінскай губерні з насельніцтвам каля 1,6 млн чалавек. Віцебская, Гомельская губерні і заходнія раёны Смаленшчыны заставаліся ў складзе РСФСР. Рыжскі мірны дагавор стаў нацыянальнай трагедыяй для беларусаў, амаль 20 гадоў заходнія рэгіёны Беларусі знаходзіліся ў складзе Польшчы.

**1.** Параўнайце стаўленне розных палітычных партый і арганізацый да пачатку Першай сусветнай вайны. Абмяркуйце, чым можна растлумачыць іх пазіцыі.

**2.** Падрыхтуйце паведамленне аб адной з ваенных аперацый, што праходзілі на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

**3.** Параўнайце Брэсцкі і Рыжскі мірныя дагаворы па самастойна выбраных крытэрыях. Ацаніце іх значэнне ў гістарычным лёсе беларускага народа.

**4.** Сфармулюйце 5 тэзісаў, адлюстраваўшы ў іх ролю і месца Беларусі ў геапалітычных працэсах пачатку XX ст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ